Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 2. С. 88–95.

УДК 9:272

# КАМЕНТАРЫІ ХРЫСЦІЯНСКІХ БАГАСЛОВАЎ ЗАХОДНЯЙ ЧАСТКІ РЫМСКАЙ ИМПЕРЫІ АБ ІНСТЫТУЦЕ ПОСТУ Ў КНІГАХ СВЯТОГА ПІСАННЯ (IV–V стст.)

**У. М. Завальнюк,**
*кандыдат гістарычных навук, ксёндз-магістр, настаяцель Мінскага Касцёла Святога Сымона і Алены*

Паступіў у рэдакцыю 22.03.17.

UDC 9:272

# COMMENTS OF CHRISTIAN THEOLOGIANS IN THE WESTERN PART OF THE ROMAN EMPIRE ABOUT THE FASTING INSTITUTE IN THE HOLY BIBLE ( IV–V CENTURIES)

**U. Zavalnyuk,**
*Candidate of History, Pries-Master, the Dean of the Minsk Cathedral of St. Simon and St. Helena*

Received on 22.03.17.

Разглядаецца станаўленне ідэі пасніцтва ў старажытнацаркоўнай літаратуры заходняй часткі Рымскай імперыі падчас трыядалагічных і хрысталагічных спрэчак у хрысціянскіх супольнасцях. Аналізуецца развіццё інстытута постніцтва ў творах Айцоў Царквы. У IV ст. скончыліся барацьба Рымскай імперыі з хрысціянствам, Царква стала дзяржаўнай і магла сканцэнтравацца для справы багаслоўскага асэнсавання веры. У рэлігійнай галіне гэта здзяйсняецца з дапамогай Царквы, якая на працягу некалькіх стагоддзяў выпрацоўвала догматы, што было адным з найважнейшых працэсаў у яе жыцці. У кантэксце свабодных багаслоўскіх спрэчак была шырока закранута тэма пасніцтва. Аналізуюцца каментарыі багасловаў заходняй часткі Рымскай імперыі аб інстытуце посту ў кнігах Святога Пісання.

*Ключавыя словы:* Пост, Царква, хрысціянства, багаслоўе, Рымская імперыя, Стары Запавет, Евангелле, гістарыяграфія, рэлігія, вучэнне.

The formation of the fasting idea in the ancient religious literature in the western part of the Roman Empire during the triodological and christological discussion in the Christian communities is considered in the article. There is an analysis of the fasting institute development in the works of the Fathers of the Church. In the IVth century the struggle of the Roman Empire against Christianity finished, the church got government status and could concentrate on the theological understanding of faith. In the religious sphere it took place with the help of the Church, when it formulated the dogma. During many centuries the development of the dogmas was one of the most important processes in the Church life. In the context of free theological dispute the question of fasting was widely discussed. The comments of theologians about fasting institute in the western part of the Roman Empire were analysed in the books of the Holy Bible.

*Keywords:* Fast, Church, Christianity, theology, the Roman Empire, the Old Testament, the Gospel, historiography, religion, teaching.

Асноўная падзея ў гісторыі Царквы IV–V стст. – гэта карэннае змяненне яе становішча ў адносінах да дзяржавы: Царква атрымала афіцыйнае прызнанне. Супрацьстаянне хрысціянства з язычніцтвам атрымала выключна новы якасны змест. Дух Евангелля, запавет любові да блізкага, настаўленне аб пашырэнні хрысціянскага вучэння без насілля неўзабаве былі парушаны ў барацьбе з традыцыйнымі вераваннямі. Пакуль хрысціяне знаходзіліся ў меншасці і па-за законам, а сама Царква падвяргалася пераследу, місіянеры прытрымліваліся прынцыпу міралюбнасці. Варта адзначыць, што пасля таго, як імператар Канстанцін даў хрысціянам свабоду, Царква набыла афіцыйную ўладу і ўсе грамадзянскія правы, у той ці іншай форме ў яе пачала праяўляцца перанасычанасць уладай. Празмерная захопленасць у імя ісціны прывяла да забыцця запаведзі любові ў адносінах да язычнікаў, ератыкоў і іўдзеяў. Так узнікла імперская Царква, перад якой адкрыліся зусім іншыя магчымасці, акрэсліліся новыя задачы. Аднак і дзяржава, асабліва праз «сакралізацыю» асобы імператара, мела цяпер новыя сродкі для ўваходжання ў яе ўнутранае жыццё. У гісторыі барацьбы з ерасямі, язычніцтвам Царква набыла грунтоўны вопыт пазіцыянавання, супрацьстаяння дзяржаўнаму і свецкаму ўмяшанню ў справы веры.

Лагічным вынікам перагрупоўкі палітычных сіл у Рымскай імперыі было значнае ўнутранае адміранне язычніцтва, якое усё ж аказвала супраціўленне і ў асобых выпадках працягвала жыць у чалавечай падсвядомасці.

У свеце, які паступова мяняўся, Царкве больш не прыходзілася траціць сілы на барацьбу за існаванне. Яе ўнутранае жыццё

Рэпазіторый БДПУ

магло развівацца самастойна, што вызначыла якасна новы ўзровень багаслоўя [1, с. 12–13].

На працягу IV–V стст. выпрацоўка догматаў была адным з найважнейшых працэсаў у жыцці Царквы, якія вызначалі яе развіццё. Дагматычныя працы багасловаў спачатку накіроўваліся на трыядалагічныя[1], а затым на хрысталагічныя[2] таямніцы веры.

З 325 г. у гісторыі Царквы адзначаюцца вялікія Усяленскія саборы (трынітарныя і хрысталагічныя спрэчкі). Нараўне з развіццём вучэння ішло далейшае ўдасканаленне царкоўнага заканадаўства, богаслужэння і манаства.

Трыядалагічная спрэчка ішла практычна ўсё IV ст. Даследчык гісторыі Усяленскіх сабораў А. У. Карташоў адзначаў, што пільная ўвага да гісторыі трыядалагічных спрэчак была выклікана праблемай – «быць ці не быць» хрысціянству. У гэты перыяд тэма «быць ці не быць» абвастрылася не ў аспекце гістарычнага быцця і росту, а ў праблеме якаснай: у сэнсе магчымай, непрыкметнай для мас, падмены самой сутнасці хрысціянства як рэлігіі збавення [2, с. 12–13].

Гісторыкі Царквы ў гэты перыяд вылучаюць тры багаслоўскія напрамкі: Новаалександрыйска-кападакійскі, Антыахійскі і Заходні. Дамінуючую ролю ў перыяд трыядалагічных спрэчак адыгралі прадстаўнікі Новаалександрыйска-кападакійскага кірунку. Да іх царкоўная гістарыяграфія адносіць св. Афанасія Александрыйскага [3], Васіля Вялікага [4], Рыгора Багаслова [5], Рыгора Ніскага [6], Амфілохія Іканійскага [7], Кірыла Александрыйскага [8]. Гэты адрэзак часу даследаваўся ў артыкуле «Каментарыі багасловаў Новалександрыйска-кападакійскай школы аб інстытуце посту ў кнігах Святога Пісання перыяду трыядалагічных спрэчак (313–381 гг.)» [9].

Да прадстаўнікоў Антыахійскага кірунку царкоўная гістарыяграфія адносіць св. Яўстафія Антыахійскага [10], Дыядора Тарсійскага, Федара Мапсуэстыйскага, св. Іаана Златавуста [11], блажэннага Феадарыта Кірскага [12]. Гэты перыяд даследаваўся ў артыкуле «Каментары багасловаў Антыахійскай школы аб інстытуце посту ў кнігах Святога Пісання падчас хрысталагічных спрэчак» [13].

Трэці напрамак у гісторыі багаслоўскай думкі хрысціянскай царквы прадстаўлены Іларыям Піктавійскім [14], Амвросіем Медыяланскім [15], Іеранімам Стрыдонскім [16], Аўгусцінам [17], Рымскім Папам Рыгорам Вялікім [18], з якіх чатыры апошнія з'яўляюцца дактарамі[3] Заходняй Царквы.

Гісторыя багаслоўскай думкі дадзенага перыяду даследавалася на працягу стагоддзяў. Яе вывучэнне пачалося багасловамі пазначанага ў артыкуле адрэзку часу (Эрміем Сазаменам Саламінскім [19], Сакратам Схаластыкам [20] і інш.).

У перыяд трыядалагічных спрэчак на ўсходзе Рымскай імперыі галоўную ролю адыгрывала Новаалександрыйска-кападакійскае багаслоўе, а падчас хрысталагічных спрэчак дамінаваў Антыахійскі напрамак, на захадзе імперыі ў гэты час багаслоўская думка не была далучана да вучэбных ці духоўных цэнтраў. Заходняя царкоўная пісьменнасць прадстаўлена духавенствам гэтай часткі імперыі, якое ў сваіх багаслоўскіх трактатах, каментарыях да кніг Святога Пісання выкарыстоўвала традыцыі алегарычнай інтэрпрэтацыі. Іх роданачальнікам лічыцца Арыген, які доўгі час працаваў у Александрыі.

У экзегетыцы Арыген развіваў алегарычны (іншасказальны) метад інтэрпрэтацыі Бібліі. Прыхільнікі пазначанага метаду лічылі, што не ўсё ў Бібліі «ляжыць на паверхні» для разумення, а наадварот, многае схавана ад першага, непасрэднага ўспрымання. Яны выходзілі з думкі, што ў Святым Пісанні ісціна выкладаецца з дапамогай знакаў і алегорый, Біблейскі тэкст наканаваны Богам для засваення простым чалавекам, таму напоўнены натуралістычнымі вобразамі, якія з'яўляюцца сімваламі іншага, духоўнага і містычнага сэнсу.

Менавіта ў кантэксце трыядалагічных і хрысталагічных свабодных багаслоўскіх спрэчак, пачатак якіх звязаецца з Міланскім эдыктам аб верацярпімасці імператараў Канстанціна (306–337 гг.) і Ліцынія (308–324 гг.), прынятым у 313 г., была шырока закранута тэма посніцтва.

Партрэтны рад заходніх багасловаў распачынае Святы Іларый Піктавійскі. Ён нарадзіўся ў 315 г. у г. Пуацье, які называўся тады Піктавіум, у знатнай гала-рымскай сям'і. Калі Іларый пачынаў сваю дзейнасць, Усход імперыі быў разарваны на часткі барацьбой з арыянствам, але на Захадзе ўсё было спакойна – большасць хрысціян прытрымлівалася сімвала веры, прынятага першым Усяленскім саборам Царквы, што адбыўся ў горадзе Нікеі ў 325 г. [21, с. 233].

Першы вядомы сістэматычны каментарый на Евангелле выходзіць з-пад пяра Арыгена

[1] Трыядалогія – вучэнне аб Найсвяцейшай Тройцы.

[2] Хрысталогія – вучэнне аб Боскай і чалавечай сутнасці ў Ісусе Хрысце.

[3] Ганаровы тытул выкарыстоўваўся з канца IV ст. для ўзвышэння багасловаў і пісьменнікаў, аўтарытэт якіх меў вагу ў фарміраванні дагматыкі, іерархічнай арганізацыі і богаслужэння Царквы, складанні канона спіса Свяшчэнных кніг Бібліі (адмежавання богадухоўных кніг ад апакрыфічных).

Рэпазіторый БДПУ

ў III ст., а першы каментарый на латыні Іларыя Піктавійскага пазначаны ў IV ст. Тэксты Іларыя, якія змяшчаюць трактоўкі на Евангелле, дайшлі да нас у форме каментарыяў і гамілій[1]. Пад «экзегетычным каментарыем» прынята разумець сістэматычнае і паслядоўнае тлумачэнне якой-небудзь кнігі Святога Пісання цалкам або часткова. Агульным тэрмінам «каментарый» аб'яднаны творы, узнікненне якіх было абумоўлена рознымі прычынамі. Адны з іх былі задуманы з адзінай мэтай – быць напісанымі і апублікаванымі для чытання. Іншыя ўяўлялі сабой аднастайныя серыі перапрацаваных гамілій, прызначаных для публікацыі ў выглядзе звязнага цэлага для забеспячэння паступовага пераходу ад адной гаміліі да іншай. Тэксты трэцяга кірунку ўяўлялі сабой лекцыі, прачытаныя ў школах, а затым перапрацаваныя для публікацыі. Што датычыцца канкрэтна каментарыяў на Евангелле Іларыя Піктавійскага і Ераніма Стрыдонскага, то іх адносяць да першай групы.

Структура гэтых экзегетычных каментарыяў вельмі простая. Тэкст, які з'яўляецца іх прадметам, падзяляецца на фрагменты. Кожнаму фрагменту адпавядае яго тлумачэнне, накіраванае на тое, каб прадэманстраваць агульны сэнс урыўка і ўсіх яго найбольш важных дэталей.

Каментарый на Евангелле, які належыць Іларыю Піктавійскаму, быў складзены прыкладна паміж 350 і 355 г. Па структуры каментарыя евангельскі тэкст разбіваецца на фрагменты, час ад часу ім даюцца тлумачэнні. Да кожнага фрагмента яны розныя: у некаторых выпадках тлумачэнні вельмі доўгія і падрабязныя, у іншых даецца толькі намёк на тлумачэнне, а часам яно наогул апускаецца.

У тлумачэннях Іларый дэманструе прыхільнасць Александрыйскай традыцыі. Разам з простай, даслоўнай апрацоўкай тэксту, выкарыстоўваючы пры яго тлумачэнні алегарызацыю, ён раскрывае глыбокае і важнае значэнне, якое можа быць адкрыта толькі праз удумлівае даследаванне. Пры ўжыванні гэтага прынцыпу інтэрпрэтацыі Іларый перакананы ў тым, што ён ні ў якой ступені не скажае першапачатковы сэнс біблейскага апавядання [22, с. XVIII–XIX].

Пост у каментарыях Іларыя Піктавійскага закранаецца некалькі разоў, а яго палажэнні змешчаны ў «Каментарыі на Евангелле ад Мацвея». Аўтар указвае, што д'ябал пераможаны той жа плоццю, якую сам жа знясільваў, а знаходжанне Госпада ў пустыні (Новы Завет. Спакуса Езуса 4: 1–11), яго саракадзённы пост, голад пасля посту, спакуса сатаны і адказы Госпада напоўнены дзеяннямі вялікай задумы. Хрыстос прагнуў не ежы чалавечай, але выратавання чалавека, калі Гасподзь прагнуў ежы, гэта не было вынікам доўгага ўстрымання, яго сілы не былі знясіленыя саракадзённым постам і Ён не страціў Сваю чалавечую прыроду, таму д'ябал быў пераможаны не Богам, але плоццю, постам чалавечай прыроды. Тым самым гэта ўказвае на вялікі сэнс, практыку і сілу посту, што перамагае зло навакольнага свету [22, с. 71].

У Каментарыях да главы 9 (Новы Завет. Пытанне пра пост 9: 14–17) адзначаецца: «...Тады прыходзяць да Яго вучні Іаанавы і кажуць: чаму мы і фарысеі посцім шмат, а Твае вучэнні не посцяць?». Іларый бачыў у посце сведчанне веры, адно з абавязковых прадпісанняў Новага Запавету. Словы Хрыста аб тым, што Яго вучням няма неабходнасці пасціцца, таму што з імі знаходзіцца Жаніх (Хрыстос), сведчаць пра радасць ад яго прысутнасці і таінстве святой ежы, у якой не будзе недахопу, пакуль Хрыстос з імі... Багаслоў указваў, што калі ён будзе адабраны ў іх, тады яны будуць пасціцца, паколькі ўсе тыя, хто не паверыць ва ўваскрасенне Хрыста, не будуць есці хлеб жыцця. Пост багаслоў прымаў як правіла і патрабаванне да хрысціянства, звяртаючы ўвагу на яго абавязковую практыку [22, с. 255].

Іларый быў сапраўдным распаўсюджвальнікам веры. На яго долю выпала непазбежная адзінота чалавека, які ў інтэлектуальным сэнсе апярэдзіў сваіх сучаснікаў. Нягледзячы на недахопы ў каментарыях і шэраг памылак яго лічаць першым заходнім багасловам, які ўдумліва і ўсебакова абгрунтаваў праблемы Тройцы і прыроды Хрыста [21, с. 234].

Святы Амвросій (339–397 гг.) быў малодшым сучаснікам святога Іларыя, прадаўжальнікам яго ідэй. Ён нарадзіўся ў знатнай хрысціянскай сям'і, якая належала да палітычных колаў (яго бацька быў прэфектам Галіі). Амвросій вядомы як адзін з чатырох вялікіх лацінскіх настаўнікаў Царквы. Яму ўдалося закончыць з хаосам, што панаваў у галіне дагматычнага багаслоўя. У сапраўдным вызнанні веры, якое абвяшчаецца Царквой, ён бачыў аснову і гарантыю яе незалежнасці. У сваіх пропаведзях і тлумачэннях ён змагаўся за ажыццяўленне рашэнняў Нікейскага сабора (325 г.) як у сферы тэалогіі, выступаючы за чысціню веры, так і ў царкоўна-палітычных пытаннях, абараняючы незалежнасць Царквы ад умяшання дзяржаўнай улады.

Асновай яго епіскапскай дзейнасці была пастырская пропаведзь, прысвечаная падра-

[1] Гамілія – адна з форм хрысціянскай пропаведзі, якая ўтрымлівае тлумачэнне прачытаных месц Свяшчэннага Пісання.

Рэпазіторый БДПУ

бязнаму тлумачэнню кніг Святога Пісання. Выкарыстоўваючы новы для Захаду алегарычны метад, Амвросій, з аднаго боку, тлумачыў іншасказальна спрэчныя месцы Старога Запавету, з другога – адкрываў у ім новыя глыбіні [1, с. 149].

Тэма посту ў творах Амвросія займала няззначнае месца, ён не ўнікаў у метафізічныя тонкасці, а выступаў як чалавек практычны. Так, каменціруючы дзеянні прарока Ілы, Амвросій указаў на такую вялікую моц посту, што слова, пасланае вуснамі посніка Ілы, закрыла неба для святатацкіх іўдзеяў. Падчас посту Ілья ўваскрасіў з мёртвых сына ўдавы; словам сваім наводзіў і звяргаў дождж з неба. Вуснамі посніка ён загадаў спыніцца водам Іардана і, не памыўшы ад пылу ногі, перайшоў раку па вадзе, якая расступілася перад ім. Боскім судом ён прызнаны быць годным Нябёсам і ўзнесеным на іх разам з целам, бо і ў целе ён жыў нябесным жыццём, быў яго ўзорам на зямлі [23, с. 115–116].

Каменціруючы пост прарокаў, Амвросій рабіў акцэнт на прынцыповым злучэнні цялеснага посту з маральнымі ўстаноўкамі запаветаў Хрыста, у якіх павучаў: «Не выхваляйся, калі посцішся; не хваліся, каб не выйшла так, што ад посту табе не будзе ніякай карысці: бо тое, што робіцца напаказ, не дасць плёну ў будучыні, а цяперашнія заслугі скасуе. Ілья заставаўся ў пустыні, так што ніхто не мог бачыць яго пост, акрамя крумкачоў ... І Елісей быў у пустыні, дзе нельга было знайсці ежы, акрамя дзікай расліны. Іаан быў у пустыні, дзе знаходзіў толькі акрыды і дзікі мёд. Даніла смакаваў яду сярод ільвоў, што пасціліся. Ён каштаваў ежу чужую, а звяры не дакраналіся да сваёй [23, с. 118].

У невялікай кнізе «Аб пасадах служыцеляў», якая стала кіраўніцтвам для святароў, аўтар яшчэ раз указвае на якасную характарыстыку хрысціянскага посту, наводзіць на думку, што пасціцца трэба скрыта, каб відаць было, што ты шукаеш узнагароды не ад людзей, толькі ад Бога твайго [24].

У трактаце «Аб дзявоцтве і шлюбе» практыку посту аўтар рэкамендуе пачынаць ужо з дзяцінства. Ён адзначае, што хай выпрабоўваецца постам нават кволы ўзрост, і ўмеранасцю ў ежы, нібы нябачнай аброццю, уціхаміраваюцца нястрымныя страсці (с. 41). Амвросій далучае пост да дабрачыннасцей: «Засявай пагоркі сэрца твайго разнастайным насеннем: умераным ужываннем ежы; строгім пастом, чытаннем, працай, малітвай ...» (с. 44). Пост і малітву ён адносіць да маральных арыенціраў (с. 59) [25].

Нягледзячы на вялікую колькасць твораў, Амвросій не стварыў на захадзе імперыі сваёй школы. Яго розум быў накіраваны на развіццё жыццёва-практычных пытанняў, а дух больш цікавілі праблемы маралі, аскезы, загартоўцы якіх дапамагае пост. Вывучыўшы трактаты ўсходніх айцоў, св. Амвросій не пайшоў далей за іх.

Такім чынам, у пісаннях святога Амвросія асноўная ўвага надавалася не багаслоўскім пытанням, а этычным. Ён застаўся рымлянінам, які не меў асаблівага настрою да абстрагаванага мыслення і засяродзіў сваю ўвагу выключна на пытаннях надзённасці і справы.

Місію папулярызацыі Святога Пісання ў Заходняй Царкве ажыццявіў адзін з найбуйнейшых экзегетаў – Еранім Стрыдонскі. Нарадзіўся ён у г. Стрыдоне на паўночным усходзе Балканскага паўвострава (каля 342 г.). Блажэнны Еранім быў пераважна чалавекам навукі і пакінуў пасля сябе багатую спадчыну літаратурных твораў. Па тэматыцы і характары гэтыя сачыненні могуць быць падзелены на чатыры віды: 1) дагматыка-палемічныя; 2) маральна-аскетычныя; 3) працы па тлумачэнні Святога Пісання; 4) гістарычныя працы. Асабліва трэба адзначыць пераклад Святога Пісання на латынь, якаі атрымаў назву «Вульгата».

Сачыненні маральна-аскетычнай тэматыкі Ераніма знайшлі адлюстраванне галоўным чынам у яго лістах (бясспрэчна аўтарскіх захавалася 120). Да надзвычай павучальных Царква адносіць наступныя: 14 да Іліадора, з усхваленнем пустэльніцтва; 22 да Яўстохія, аб захаванні зароку цнатлівасці; 52 да Непацына, аб манаскіх дабрадзейных справах у сувязі з адлюстраваннем ідэалу пастырскага служэння; 58 да Паўліна, з навучаннямі манаху. Сюды ж аднесены і складзеныя блажэнным Еранімам жыццеапісанні падзвіжнікаў: Паўла Фівейскага (376 г.), Малха-манаха і святога Іларыёна (напісаны каля 379 г.); 103 ліст да Яўстохіі змяшчае біяграфію Паўлы – Віфлеемскай паплечніца Ераніма [26, с. 334–337].

Сачыненні блажэннага Ераніма ў сваёй большасці з’яўляюцца філалагічнымі тлумачэннямі, якія нярэдка пераходзяць у гутаркі містыка-алегарычнага характару.

Яго экзегетыку нельга характарызаваць адназначна. З аднаго боку, пад уплывам Арыгена ён аддаваў даніну алегарычнаму метаду, вельмі многае тлумачыў іншасказальна. Але, з іншага боку, ён часта аддаваў перавагу гістарычнаму прамому сэнсу і адзначаў, што ён патрабуе іншых экзегетычных правілаў, чым алегарызм (Ліст 65). Свой метад Еранім характарызаваў наступным чынам: «Неабходнасць змушае мяне накіроўваць шлях маёй мовы паміж гісторыяй і алегорыяй, падобна да таго, як гэта бывае паміж скаламі і падводнымі камянямі ... Ад волі чытача, вядома, будзе зале-

Рэпазіторый БДПУ

жаць прачытанне таго і іншага [тлумачэння ] і яго рашэння, чаго больш ён павінен прытрымлівацца» (Толк. на Навума 2: 1). [27, с. 488].

Пост у творчасці Ераніма тлумачыўся эпізадычна, а ў большасці выпадкаў каментарыі насілі эмацыянальную афарбоўку. Так, у каментарыі да кнігі прарока Іоліі (1:1-20), дзе нашэсце саранчы было вызначана як Божая кара за грахі, Еранім канстатаваў, што беззаконне народа наклікае гнеў Божы і спустошвае зямлю. Толькі пакаянне ўсяго народа і «асвячоны пост паслужыць збаўленнем ад грахоў» [28, с. 60].

Святасць посту Еранім пераводзіў у тлумачэннях на прарока Міхея, дзе засмучаўся над заганнымі паводзінамі іерархаў царквы, параўноўваючы іх з ганебнымі эпізодамі іўдзейскай гісторыі. ... Правадыры народа Майго будуць выкінуты з дамоў забаў сваіх; па прычыне злых пачынанняў сваіх яны былі абвергнуты. Гэта месца, лічыў Еранім, можа быць звернута да валадароў іудзейскага народа, святароў і фарысеяў, якія пасля смерці Бога былі выгнаны з горада забаў сваіх, дзе раней яны аддаваліся разгулу з прычыны злых пачынанняў сваіх (Быц. 49:10).

Аднак, Еранім быў схільны ў прароцкай прамове закрануць таксама уладароў царквы, якія тонуць у разгулах і думаюць, што сярод балю і забаў яны захоўваюць цнатлівасць. Аднак такія служкі павінны быць выкінуты са сваіх раскошных палат, адарваны ад пышных баляванняў і банкетаў, якія каштавалі вялікіх грошай. Яны павінны быць выкінуты з прычыны дрэнных пачынанняў і дзеянняў сваіх. А калі хочаш ведаць, куды яны павінны быць выкінуты, то Еранім паказваў – чытай Евангелле: у цемру пякельную, дзе «будзе плач і скрыгатанне зубоў» (Мацвей. 22:13). Няўжо не ганебна і не сорамна прапаведаваць раскрыжаванага Хрыста, Настаўніка, беднага і пакутуючага ад смагі, маючы ўкормленыя целы, і абвяшчаць вучэнне пра пост вуснамі, чырвонымі ад віна і з растаўсцелым тварам? Калі мы зоймем месца апосталаў, то будем падтрымліваць не толькі словы пропаведзі іх, але і паводзіны, і ўстрыманне іх [29].

Пост як інструмент барацьбы з д'яблам быў пададзены і ў каментарыях да кніг Новага Запавету. Еранім паказаў, што малавер'е бацькі апантанага юнака – хвароба душы. Аднак нават недасканалая вера прыводзіць да Госпада, які дэманструе выгнанне д'ябла дакрананнем чалавечай рукі. Пры гэтым Ісус указваў на малітву і пост як неабходныя ўмовы, інструментарый для выгнання нячыстай сілы [30, с. 144–146].

Напоўнены новым духоўным зместам пост у Ераніма мы знаходзім у каментарыях на Евангелле ад Мацвея, дзе аўтар у роспачы ад таго, што той крывадушнік, хто, падаючы міласціну, гучна грае перад сабой на трубе. Крывадушнік таксама і той, хто посціцца, але пры гэтым робіць змрочным выраз твару свайго, каб знешнім выглядам паказаць пустэчу свайго страўніка. Крывадушнік і той, хто моліцца ў месцах зборышчаў і на вуглах вуліц, каб яго бачылі людзі. Багаслоў абгрунтаваў знайшоў правілы посту (Мф.6: 17–19): «Калі посцішся, то памаж галаву тваю і памый аблічча тваё, каб з'явіцца поснікам не перад людзьмі, а перад Айцом тваім, які ў тайне; і Айцец твой, які бачыць і ведае ўсё, аддасць табе яўна. Не збірайце сабе скарбаў на зямлі, дзе моль і ржа нішчаць, дзе зладзеі падкопваюць і крадуць [31, с. 12].

Каментарыі Ераніма паказваюць, што традыцыі заходняй экзегетыкі арыентаваны на літаральны, духоўны, маральны і нават містычны сэнсы. Алегорыя ў творчасці Ераніма, як і ў творчасці папярэдніх багасловаў, адпавядала мадэлі экзегезы.

Аўгусцін Іпанійскі ў гісторыі Царквы прызнаны як найбольш плённы аўтар з шэрагу раннехрысціянскіх багасловаў лацінскага Захаду. Па пытаннях тэалогіі ён пакінуў глыбокі след на духоўным полі дзейнасці гэтай часткі Царквы ... Аўгусцін нарадзіўся ў 354 г., на дзевяць гадоў пазней, чым Еранім і на чатырнаццаць гадоў пазней, чым Амвросій. Ён быў выхадцам з Афрыкі, дзе прайшла большая частка яго жыцця. Маці св. Аўгусціна была хрысціянкай, аднак бацька яго не прыняў. Сам св. Аўгусцін доўгі час прытрымліваўся маніхейства, а затым стаў католікам і быў ахрышчаны Амвросіем ў Мілане. Каля 396 г. ён стаў епіскапам Іпона, што непадалёк ад Карфагена. Тут ён заставаўся да сваёй смерці [32, с. 329].

Аўгусцін знакаміты цэлым шэрагам кніг, асабліва аўтабіяграфічным творам «Споведзь» і трактатам «Пра град Божы». Багаслоў пакінуў шматлікія каментарыі і пропаведзі на кнігі Святога Пісання, у якіх падымалася тэма посніцтва.

Аўгусцін быў перакананы, што практыка Вялікага посту мае важнае значэнне: «І прабыў там [Майсей] у Госпада сорак дзён і сорак начэй, хлеба не еў і вады не піў». Галоўным і бясспрэчным аргументам практыкі посту аўтар прымае прыклад і запавет Ісуса [33, с. 217].

У «Трактаце на Евангелле ад Іаана» Аўгусцін паказаў Вялікі пост як шчыры. Аўтар напоўніў яго характарыстыку новым евангельскім патрабаваннем да зместу: «Устрымлівацца ад беззаконняў і недапушчальных уцех свету гэтага – ёсць пост дасканалы: каб мы, абвергшы бязбожнасць і зямную пажаднасць, устрымана, праведна і пабожна жылі ў гэтым веку» [34, с. 371].

У каментарыі на Пропаведзь № 53 з Кнігі Быцця Аўгусцін указваў на такую галоўную дэталь посту, як умеранасць (25: 27–34). Аўтар па-

Рэпазіторый БДПУ

казвае на ўмеранасць у жаданнях як на дабрачыннасць, што павінна спалучыцца з постам. Як пераяданне выстаўляецца на ганьбаванне, так і ўзбуджальнікі апетыту выключаюцца. Не ў тым сэнсе, што пэўныя віды ежы павінны выклікаць агіду, але ў тым, што цялеснае задавальненне кантраляваць. Ісаў атрымаў ганьбаванне не за тое, што захацеў тлустага цяля або неабескроўленай дзічыны, але за тое, што без меры пажадаў стравы з сачыўкі [35, с. 188].

Яшчэ адну важную запаведзь Хрыста Аўгусцін указаў у Пропаведзі № 25, пракаменціраваўшы радкі з Новага Запавету (2: 11–15) аб дзеянні божай ласкі ў слабых і моцных у веры, дзе слабыя ў веры павінны быць прыняты з любоўю і цярпеннем, але яны, у сваю чаргу, павінны ўстрымацца ад асуджэння іншых. Такім чынам Павел хацеў утрымаць раўнавагу, каб пазбегнуць спрэчак паміж поснікамі ў суботу і няпоснікамі, каб той, хто есць не абвяргаў таго, хто не есць, і той, хто не есць, не асуджаў таго, хто есць.

Пад «нямоглымі ў веры» Павел меў на ўвазе тых, хто ўстрымліваўся ад мяса, слабых здароўем, прыхільнікаў закона Майсея або няўпэўненых у веры. Гэта было прадметам спрэчак сярод тлумачальнікаў, якія, аднак, былі аднадушныя ў тым, што хрысціяне павінны заўсёды прымаць пад увагу пачуцці і перакананні сваіх блізкіх і ўстрымлівацца ад суда і асуджэння, памятаючы, што яны самі стануць перад суддом Божым і што яны павінны і жыць, і паміраць для Бога [36, с. 496].

Святаайцоўская экзегетыка заходніх багасловаў IV–V стст. – гэта каментарыі Бібліі, выказаныя з верай. З пункту гледжання багасловаў, разуменне Святога Пісання было дарам, аб якім варта было маліцца.

Анры дэ Любак, які дэталёва вывучаў багаслоўе старажытнай Царквы, працы заходніх багасловаў IV–V стст., прыйшоў да высновы, што метадалогія з'яўляецца сучасным вынаходствам. Тлумачальнікі Пісання вышэйадзначага перыяду жыцця Царквы даручалі сябе натхненню Духа Святога і загадзя не клапаціліся аб ёй. Адпраўной кропкай патрыстычнай экзегезы Старога Запавету заўсёды была вера ў тое, што ён цалкам прарочыць пра Хрыста, і ў адваротным парадку – багасловы верылі ў тое, што Хрыстос дае ключ да разумення Старога Запавету. Сапраўдным аўтарам Пісання для Айцоў Царквы заходняй часткі імперыі лічыўся Святы Дух, а Святы Дух адзін, таму Стары і Новы Запавет вучаць адзінай ісціне. На іх думку, паколькі аўтарам Пісання з'яўляўся Святы Дух, то яно не можа ўстарэць або згубіць сваё значэнне.

Такім чынам, багасловы заходняй Царквы IV–V стст. верылі, што правільнае разуменне Пісання вядзе да святасці, чым прынцыпова кіраваліся, каменціруючы біблейскія тэксты. У сувязі з гэтым сучасны гісторыка-крытычны метад здаўся б ім, па меншай меры, пазбаўленым сэнсу. Паводле апошняга, сэнс тэксту вызначаецца выключна канкрэтнымі падзеямі мінулага, а прывязванне тэксту да сучаснасці – асабліва, калі гэта ажыццяўляецца пад знакам веры, – некарэктна і таму падазрона. У багасловаў заходняй Царквы IV–V ст. просты пераказ мінулага лічыцца бессэнсоўным, і яны пастаянна задаюцца пытаннем аб тым, якім чынам тэкст гаворыць з намі, дапамагае нам.

### Літаратура


1. *Лортц, Йозеф.* История Церкви (рассмотренная в связи с историей идей) : в 2 т. / Йозеф Лортц. – М. : Христианская Россия, 1999–2000. – Т. 1 : Древность и Средние века. – 1999. – 511 с.
2. *Карташев, А. В.* Вселенские соборы / А. В. Карташев. – М. : Республика, – 1994. – 542 с.
3. Великий, Афанасий свт. Избранные творения. Нравственные правила и беседы : в 4 т. / свт. А. Великий (около 295–373). – Изд. Спассо-Преображенского Волокаламского монастыря. – 1994. – Т. 1 – 524. XIII, – 2 [ с. – Репр. Воспр.].
4. *Великий, Василий* свт. Избранные творения. Нравственные правила и беседы / свт. В. Великий – Минск : Белорусский Экзархат Московского Патриархата, 2014. – 704 с.
5. *Богослов, Григорий,* свт. Архиепископ Константинопольский: собр. творений : в 2 т. / свт. Г. Богослов – Свято-Троицкая Сергиева Лавра 1994. – Т. 2. – 680 с. [Репр. изд.].
6. *Нисский, Григорий.* Аскетические сочинения / Г. Нисский // Православная Библиотека. – Режим доступа : http://www.golden-ship.ru/load/. – Дата доступа : 10.05.2015.
7. *Иконийский, Амфилохий.* Беседа о покаянии или о том, что не должно отчаиваться в спасении / А. Иконийский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http: // azbyka.ru/otechnik/Amfilohij_Ikonijskij / beseda-o-pokajanii-ili-o-tom-chto-ne-dolzhno-otchaivatsja-v-spasenii/ – Дата доступа : 10.04.2015.


### References


1. *Lortz, Yozef.* Istoriya Tserkvi (rassmotrennaya v svyazi s istoriyey idey) : v 2 t. / Yozef Lortz. – M. : Khristianskaya Rossiya, 1999–2000. – T. 1 : Drevnost i Sredniye veka. – 1999. – 511 s.
2. Kartashev, A. V. Vselenskiye sobory / A. V. Kartashev. – M. : Respublika. – 1994. – 542 s.
3. *Velikiy, Afanasiy* svt. Izbrannyye tvoreniya. Nravstvennyye pravila i besedy : v 4 t. / svt. A. Velikiy (okolo 295-373). – Izd. Spasso-Preobrazhenskogo Volokolamskogo monastyrya. – 1994. – T. 1. – 524. XIII. – 2 [s. – Repr. Vospr.].
4. *Velikiy, Vasiliy*, svt. Izbrannyye tvoreniya. Nravstvennyye pravila i besedy / svt. V. Velikiy. – Minsk : Belorusskiy Ekzarkhat Patriarkhata, 2014. – 704 s.
5. *Bogoslov, Grigoriy*, svt. Arkhiyepiskop Konstantinopolskiy: sobr. tvoreniy : v 2 t. / svt. G. Bogoslov. – Svyato-Troitskaya Sergiyeva Lavra 1994. – T. 2. – 680 s. [Repr. izd.].
6. *Nisskiy, Grigoriy*. Asketicheskiye sochineniya / G. Nisskiy // Pravoslavnaya Biblioteka. – Rezhim dostupa : http://www.golden-ship.ru/load/. – Data dostupa : 10.05.2015.
7. *Ikoniyskiy, Amfilokhiy.* Beseda o pokayanii ili o tom, chto ne dolzhno otchaivatsya v spasenii / A. Ikoniyskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. Rezhim dostupa: http: // azbyka.ru/otechnik/Amfilohij_Ikonijskij / beseda-o-pokajanii-ili-o-tom-chto-ne-dolzhno-otchaivatsja-v-spasenii/ – Data dostupa : 10.05.2015.


Рэпазіторый БДПУ

8. *Александрийский, Кирилл.* О поклонении и служении в Духе и истине / К. Александрийский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http://azbyka.ru/otechnik / Kirill_Aleksandrijskij/o-poklonenii-i-sluzhenii-v-dukhe-i-istine/ – Дата доступа : 01.04.2015.
9. *Завальнюк, У. М.* Каментарыі багасловаў Новаалександрыйска-кападакійскай школы аб інстытуце посту ў кнігах Святога Пісання перыяду трыядалагічных спрэчак (313–381 гг.) / У. М. Завальнюк // Весці БДПУ. – 2015. – № 4. – С. 50–55.
10. *Антиохийский, Евстафий.* Слово на вечерю Лазаря и на Марию и Марфу, сестер его / Евстафий Антиохийский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : azbyka.ru / otechnik / Evstafij_Antiohijskij / slovo_na_vecheryu_Lazarya_i_na_Mariyu_i_Marfu /. – Дата доступа : 01.04.2015.
11. *Златоуст, Іоанн.* Творения святого отца нашего Иоанна Златоуста, архиепископ Константинопольского / Іоан Златоуст : в 12 т. – С.-Петербург: Изд. С.-Петербургской Духовной Академии, – 1901. – Т. 7, кн. 1 – 471 с.
12. *Кирский, Феодорит.* Творение блаженного Феодорита Кирского, епископа Кирского: в 8 ч. / Феодорит Кирский. – М. : Тип. В. Готье, 1856. – Тт. 26–28.
13. *Завальнюк, У. М.* Каментарыі багасловаў Антыахійскай школы аб інстытуце посту ў кнігах Святога Пісання падчас хрысталагічных спрэчак / У. М. Завальнюк // Весці БДПУ. – 2016. – № 2. – С. 77–83.
14. *Пиктавийский, Иларий* О троице (фрагменты) Любак, Анри де. Католичество: Социальные аспекты догмата / Анри де Любак – Милан: Христианская Россия, 1992. – 400 с.
15. *Медиоланский, Амвросий.* Полные творения / Св. Амвросий Медиолански. – Киев : 1875.
16. *Стридонский, Иераним* Толкование Евангелия. Блаженный Иераним Стридонский – Минск : Лучи Софии, 2013. – 320 с.
17. Августин, Аврелий, Об истинной религии. Теологический трактат / Блаженный Августин. – Минск : ООО «Харвест», 1999. – 1598 с.
18. *Патерик Римский:* Диалоги Григория Великого в древнеславянском переводе / изд. Подг. К. Дидди ; Редкол.: А. А. Турилов и др. – М. : Индрик, 2001. – 505 с.
19. *Саламинский, Эрмий Созомен.* Церковная история Эрмия Созомена Саламинсккго / Э. С. Саламинский. – СПб. : Тип. Фишера, 1851. – 636 с. XXXVI.
20. *Сократ, Схоластик.* Церковная история / С. Схоластик. – М. : РОССПЭН, 1996. – 368 с.
21. *Мейендорф, Иоанн* (протоиерей) Введение в святоотеческое богословие / И. Мейендорф (протоиерей). – Минск : Лучи Софии, 2007. – 384 с.
22. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Новый Завет. Т. I а : Евангелие от Матфея 1–13 / под ред. Манлио Симонетти; рус. изд. под ред. Ю. Н. Варзонина ; пер. с англ., греч., лат., сир. – Тверь : Герменевтика, 2007. – 432 с.
23. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Ветхий Завет. Т. V : Исторические книги (часть 2), Книги Царств (3-я и 4-я ), Паралипоменон (1-я и 2-я ); Ездры (1-я), Неемии и Есфири / пер. с англ., греч., лат., сир; под ред. Джона Р. Фрэнки; рус. изд. под ред. Ю. Н. Варзонина. – Тверь: Герменевтика, 2011. – 512 с.
24. *Медиоланский, Амвросий.* Об обязанностях священнослужителей. Книга 2 / А. Медиоланский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http://azbyka.ru/ otechnik/Amvrosij_Mediolanskij/ob-objazannostjah-svjashennosluzhitelej-kniga-2. – Дата доступа : 01.04.2016.
25. *Медиоланский, Амвросий.* О девстве и браке / А. Медиоланский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http://azbyka.ru/ otechnik/Amvrosij_Mediolanskij/ o-devstve-i-brake. – Дата доступа : 01.04.2016
26. *Писарев, Л. И.* Иероним / Л. И. Писарев // Православная богословская энциклопедия. Том 6. Изд-е Петроград. Ред. Н. Н. Глубоковского, Приложение к духовному журналу «Странник» за 1905 г. С. 1026.
27. *Мень Александр* «Библиологический словарь»: в 4 т. / протоирей А. Мень // Фонд имени Александр Меня. – СПб., 2002. – Т. 1. – 608 с.

8. *Aleksandriyskiy, Kirill.* O poklonenii i sluzhenii v Dukhe i istine / K. Aleksandriyskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. Rezhim dostupa: http://azbyka.ru/otechnik / Kirill_Aleksandrijskij/ o-poklonenii-i-sluzhenii-v-dukhe-i-istine/ – Data dostupa: 01.04.2015.
9. *Zavalnyuk, U. M.* Kamentaryi bagaslovau Novaaleksandryyska-kapadakiyskay shkoly ab instytutse postu u knigakh Svyatoga Pisannya peryyadu tryyadalagichnykh sprechak (313-381 gg.) / U. M. Zavalnyuk // Vestsi BDPU. Seryya 2. – 2015. – № 4. – S. 50–55.
10. *Antiokhiyskiy, Yevstafiy.* Slovo na vecheryu Lazarya i na Mariyu i Marfu, sestyor yego / Yevstafiy Antiokhiyskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. Rezhim dostupa: azbyka.ru / otechnik / Evstafij_Antiohijskij / slovo_na_vecheryu_Lazarya_i_na_Mariyu_i_Marfu / – Data dostupa: 01.04.2015.
11. *Zlatoust, Ioann.* Tvoreniya svyatogo ottsa nashego Ioanna Zlatousta, arkhiyepiskopa Konstantinopolskogo / Ioann Zlatoust : v 12 kn. – S.-Peterburg : Izd. S.-Peterburgskoy Dukhovnoy Akademii. – 1901. – T. 7, kn. 1. – 471 s.
12. *Kirskiy, Feodorit.* Tvoreniye blazhennogo Feodorita Kirskogo, yepiskopa Kirskogo / Feodorit Kirskiy. – V 8 ch. – M. : Tip. V. Gotye, 1856. – Tt. 26–28.
13. *Zavalnyuk, U. M.* Kamentaryi bagaslovau Antyakhiyskay shkoly ab instytutse postu u knigakh Svyatoga Pisannya padchas khrystalagichnykh sprechak / U. M. Zavalnyuk // Vestsi BDPU. Seryya 2. – 2016. – № 2. – S. 77–83.
14. *Piktaviyskiy, Ilariy.* O troitse (fragment). Lyubak, Anri de. Katolichestvo: Sotsialnyye aspekty dogmata / Anri de Lyubak. – Milan: Khristianskaya Rossiya, 1992. – 400 s.
15. *Mediolanskiy, Amvrosiy.* Polnyye tvoreniya / Sv. Amvrosiy Mediolanski. – Kiyev : 1875.
16. *Stridonskiy, Iyeranim.* Tolkovaniye Yevangeliya. Blazhennyy Iyeranim Stridonskiy. – Minsk : Luchi Sofii, 2013. – 320 s.
17. Avgustin, Avreliy. Ob istinnoy religii. Teologicheskiy traktat / Blazhennyy Avgustin. – Mn. : OOO "Kharvest", 1999. – 1598 s.
18. *Paterik Rimskiy:* Dialogi Grigoriya Velikogo v drevneslavyanskom perevode / izd. Podg. K. Diddi; Redkol. : A. A. Turilov i dr. – M. : Indrik, 2001. – 505 s.
19. *Salaminskiy, Ermiy Sozomen.* Tserkovnaya istoriya Ermiya Sozomena Salaminskogo / E. S. Salaminskiy. – SPb. : Tip. Fishera, 1851. – 636 s. XXXVI.
20. *Sokrat, Skholastik.* Tserkovnaya istoriya / S. Skholastik. – M. : ROSSPEN, 1996. – 368 s.
21. *Meyendorf, Ioann* (protoiyerey). Vvedeniye v svyatootecheskoye bogosloviye / I. Meyendorf (protoiyerey). – Minsk : Luchi Sofii, 2007. – 384 s.
22. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Novyy Zavet. T. I a : Yevangeliye ot Matfeya 1-13 / pod red. Manlio Simonetti; rus. izd. pod red. Yu. N. Varzonina; per. s angl., grech., lat., sir. – Tver : Germenevtika, 2007. – 432 s.
23. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Novyy Zavet. T. V : Istoricheskiye knigi (chast 2), Knigi Tsarst (3-ya i 4-ya), Paralipomenon (1-ya i 2-ya); Yezdry (1-ya), Neyemii i Yesfiri / per. s angl., grech., lat., sir.; pod red. Dzhona R. Frenki; rus. izd. pod red. Yu. N. Varzonina. – Tver: Germenevtika, 2011. – 512 s.
24. *Mediolanskiy, Amvrosiy.* Ob obyazannostyakh svyashchennosluzhiteley. Kniga 2 / A. Mediolanskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. – Rezhim dostupa : http://azbyka.ru/ otechnik/Amvrosij_Mediolanskij/ob-objazannostjah-svjashennosluzhitelej-kniga-2 – Data dostupa: 01.04.2016.
25. *Mediolanskiy, Amvrosiy.* O devstve i brake / A. Mediolanskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. – Rezhim dostupa : http://azbyka.ru/ otechnik/Amvrosij_Mediolanskij/ o-devstve-i-brake – Data dostupa: 01.04.2016.
26. *Pisarev, L. I.* Iyeronim / L. I. Pisarev // Pravoslavskaya bogoslovskaya entsiklopediya. Tom 6. Izd-ye Petrograd. Red. N. N. Glubokovskogo, Prilozheniye k dukhovnomu zhurnalu "Strannik" za 1905 g. – S. 1026.
27. *Men, Aleksandr.* "Bibliograficheskiy slovar" / v 4 t. / protoiyerey A. Men // Fond imeni Aleksandra Menya. – SPb. – 2002. – T. 1. – 608 s.


Рэпазіторый БДПУ

28. Библейские комментарии Отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Ветхий Завет. Т. XIV : Двенадцать пророков / под ред. Альберто Ферейро ; рус. изд. под ред. Д. С. Бирюкова ; пер. с англ., греч., лат., сир. – Тверь : Герменевтика, 2010. – 368 с.
29. *Стридонский, Иероним.* Две книги толкований на пророка Михея / И. Стридонский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http://azbyka.ru/ otechnik/Ieronim_Stridonskij/dve-knigi-tolkovanij-na-proroka-mikheja. – Дата доступа : 01.04.2016.
30. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Новый Завет. Т. 2 : Евангелие от Марка / под ред. Т. К. Одэн и К. А. Холл ; рус. изд. под ред. К. К. Гаврилкин и С. С. Козин ; пер. с англ., греч., лат., сир. – Тверь : Герменевтика, 2001. – 400 с.
31. *Стридонский, Иероним.* Толкование на Евангелие по Матфею / И. Стридонский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режим доступа : http://azbyka.ru / otechnik/Ieronim_Stridonskij / tolkovanie-na-evangelie-po-matfeju / 6. – Дата доступа : 01.04.2016.
32. *Рассел, Бертран.* История западной философии и ее связи с политическими и социальными условиями от античности до наших дней : в 3-х кн. / Р. Бертран. – 3-е изд. стер. – М. : Академический Проект, 2000. – 768 с.
33. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Ветхий Завет. Т. III : Книги Исход, Левит, Числа, Второзаконие / пер. с англ., греч., лат., сир; под ред. Джозефа Т. Линхарда; рус. изд. под ред. Н. А. Кульковой и С. С. Козина. – Тверь: Герменевтика, 2010. – 624 с.
34. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Новый Завет. Т. 9 : Послания к Колоссянам, Фессаловикийцам 1-е и 2-е, Тимофею 1-е и 2-е, Титу, Филимону / под ред. Питер Гордэй ; рус. изд. под ред. А. М. Шуфрин и Г. И. Беневич. пер. с англ., греч., лат., сир. – Тверь : Герменевтика, 2006. – 480 с.
35. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Ветхий Завет. Т. II : Бытия 12-50 / Под редакцией Марк Шеридан / рус. изд. под ред. Ю. Н. Варзонин и С. С. Козин. пер. с англ., греч., лат. и сир. – Тверь : Герменевтика, 2005. – 512 с.
36. Библейские комментарии отцов Церкви и других авторов I–VIII веков. Новый Завет. Т. 6 : Послание к Римлянам / под ред. Дж. Брэй ; рус. изд. под ред. К. К. Гаврилкина и С. С. Козина : пер. с англ., греч., лат., сир. – Тверь : Герменевтика, 2003. – 632 с.

28. Bibleyskiye kommentarii Ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Vetkhiy Zavet. T. XIV : Dvenadtsat prorokov / pod red. Alberto Fereyro ; rus. izd. pod red. D. S. Biryukova; per. s angl., grech., lat., sir. – Tver : Germenevtika, 2010. – 368 s.
29. *Stridonskiy, Iyeronim.* Dve knigi tolkovaniy na proroka Mikheya / I. Stridonskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. – Rezhim dostupa : http://azbyka.ru/ otechnik/Ieronim_Stridonskij/dve-knigi-tolkovanij-na-proroka-mikheja – Data dostupa: 01.04.2016.
30. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Novyy Zavet. T. 2 : Yevangeliye ot Marka / pod red. T. K. Oden i K. A. Kholl ; rus. izd. pod red. K. K. Gavrilkin i S. S. Kozin ; per. s angl., grech., lat., sir. – Tver : Germenevtika, 2001. – 400 s.
31. *Stridonskiy, Iyeronim.* Tolkovaniye na Yevangeliye po Matfeyu / I. Stridonskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. – Rezhim dostupa: http://azbyka.ru / otechnik/Ieronim_Stridonskij / tolkovanie-na-evangelie-po-matfeju / 6. – Data dostupa: 01.04.2016.
32. *Rassel, Bertran.* Istoriya zapadnoy filosofii i yeyo svyazi s politicheskimi i sotsialnymi usloviyami ot antichnosti do nashikh dney : v 3-kh kn. / R. Bertran. – 3-ye izd. ster. – M. : Akademicheskiy Proyekt, 2000. – 768 s.
33. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Vetkhiy Zavet. T. III : Knigi Iskhod, Levit, Chisla, Vtorozakoniye / per. s angl., grech., lat., sir; pod red. Dzhozefa T. Linkharda; rus. izd. pod red. N. A. Kulkovoy i S. S. Kozina. – Tver : Germenevtika, 2010. – 624 s.
34. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Novyy Zavet. T. 9 : Poslaniya k Kolossyanam, Fessalonikiytsam 1-ye i 2-ye, Timofeyu 1-ye i 2-ye, Titu, Filimonu / pod red. Piter Gordey ; rus. izd. pod red. A. M. Shufrin i G. I. Benevich. per. s angl., grech., lat., sir. – Tver : Germenevtika, 2006. – 480 s.
35. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Vetkhiy Zavet. T. II : Bytiya 12-50. / Pod redaktsiyey Mark Sheridan / rus. izd. pod red. Yu. N. Varzonin i S. S. Kozin. per. s angl., grech., lat. i sir. – Tver : Germenevtika, 2005. – 512 s.
36. Bibleyskiye kommentarii ottsov Tserkvi i drugikh avtorov I-VIII vekov. Novyy Zavet. T. 6 : Poslaniye k Rimlyanam / pod red. Dzh. Brey ; rus. izd. pod red. K. K. Gavrilkina i S. S. Kozina per. s angl., grech., lat., sir. – Tver : Germenevtika, 2003. – 632 s.


Репозиторий БГПУ